ББК 86
Мал 18

**Маліноўскі Яўген**

Парусія: псіхалогія прысутнасці. — Баранавічы : Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны", 2007. — 260 с., іл.

ББК 86

© Грамадскае аб'яднанне
"Таварыства беларускай мовы
імя Францішка Скарыны" 2007
© Афармленне Уладзімір Гундар

## Прыйсьці да ... веры

### Прадмова

Шаноўнае спадарства! Вы трымаеце ў руках кнігу баранавіцкага грэка-каталіцкага сьвятара айца Яўгена Маліноўскага "Парусія: псыхалёгія прысутнасьці". Артыкулы з гэтае кнігі пэўны час друкаваліся на старонках мясцовай газэты Intex-press і мелі вялікі водгук у грамадзтве. Сябры і прыхільнікі уніяцкай парафіі вырашылі сабраць ў адзінае цэлае, ка[illegible] напісанае настаяцелем баранавіцкага прыходу св. Кірылы і Мятода Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы, надрукаваць суцэльнай кнігай.

У мінулым стагоддзі ўніяцкі сьвятар Леў Гарошка, які ў гады Другой сусьветнай вайны кіраваў у Баранавічах медычнай школай, напісаў кнігу "Навука і рэлігія". Аўтар абвяргаў савецкія тэзісы аб шкоднасьці рэлігіі, нясумяшчальнасьці веры ў Бога і навукі, пераканаўча даказваў, што найбольшыя вучоныя ў аграмаднай большасьці былі веруючымі людзьмі. Традыцыі архімандрыта Льва Гарошкі жывуць і працягваюцца сёньняшнімі ягонымі пасьцежнікамі.

Кніга айца Яўгена Маліноўскага "Парусія: псыхалёгія прысутнасьці" – гэта першы вопыт псыхалягічнага абагульненьня рэлігійнай і палітычнай практыкі. Хацеў бы адзначыць, што гэтую тэму сучасныя навукоўцы і сьвятары дэлікатна абыходзяць, "пераканаўча" спасылаючыся, што сапраўдная рэлігія па-за палітыкай. Пэўна яно так і ёсьць у дэмакратычным грамадзтве, але не ў нас. Трэба прызнаць мужнасьць уніяцкага сьвятара, які ў сваіх разважаньнях пра Бога і існасьць спалучае рэлігію і палітыку, псыхалёгію і мастацтва. Праўда, айца Яўгена цікавіць не столькі сама палітыка, як правая свабода. І калі палітыка перашкаджае свабодзе, то трэба аб гэтам смела казаць. Але на такі крок сёньня здольны не кожны чалавек.

Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае было прававой дзяржавай, у якой панавала воля і талерантнасьць. Прыгонныя сяляне і стараверы сотнямі тысячаў беглі сюды з Расеі ад дэспатызму. Перасьледаваныя на радзіме ардынс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

II.17. Выбары ........................................ 78
II.18. Палітыка ........................................ 81
II.19. Жэрабя кінута ........................................ 85
II.20. Пост ........................................ 88
II.21. Пасха ........................................ 91
II.22. Духоўнасць ........................................ 93
II.23. Хараство ........................................ 96
II.24. Быць ........................................ 99
II.25. Тройца ........................................ 102
II.26. Слава ........................................ 105
II.27. Храм ........................................ 108
II.28. Лішак ........................................ 111
II.29. "Не хочу иметь ребенка..." ........................................ 116
II. 30. Радаснае ганенне ........................................ 117
II.31. Вавілонская вежа тэлерэчаіснасці ........................................ 123
II.32. Час асабістай прысутнасці ........................................ 127
II.33. Выбранасць ........................................ 131
II.34. Ад сектанцтва да еднасці ........................................ 134

III
ЭКЗІСТЭНЦЫЯ ВЫХАВАННЯ ........................................ 137
III.1. Успенне ........................................ 138
III.2. Акмеалагічная перспектыва ўзросту ........................................ 142
III.3. Тэапсіхалагічная канфесійнасць асобы ........................................ 150
III.4. Сямейная трапеза экумены ........................................ 153
III.5. Прафесія маці ........................................ 156
III.6. Прафесія: айцец ........................................ 160
III.7. Сямейная парусія: "Сем хлябоў і дзве рыбы" ........................................ 164
III.8. Вяртанне да сябе ........................................ 169
III.9. Інтралог ........................................ 172
III.10. У сям'і не без нарцыса ........................................ 176
III.11. Любоў не раздражняецца ........................................ 180
III.12. Ружанец у псіхічным развіцці дзіцяці ........................................ 183
III.13. "Лебядзінае паляванне" ........................................ 188
III.14. Містыка ........................................ 189
III.15. Алтарна-педагагічныя разважанні ........................................ 192
III.16. Педагагічныя прынцыпы асабістай свабоды ........................................ 196

IV
ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАПАВЕДЗЬ ........................................ 203
IV.1. Псіхагістарычны сэнс Евангелля ........................................ 204
IV.2. Час казання ........................................ 206
IV.3. Вызваленне спаралізаванага ........................................ 208
IV.4. "Хай будуць усе адно" ........................................ 210
IV.5. Суд Божы ........................................ 215
IV.6. Цуд Божы ........................................ 218
IV.7. Навігацыя ........................................ 221
IV.8. Экзарцызм, альбо выгнанне дэманаў ........................................ 224
IV.9. Перамяненне Гасподняе ........................................ 226
IV.10. Pietas – Шанаванне ........................................ 228
IV.11. Не судзі ........................................ 230
IV.12. Багацце ад Бога ........................................ 232
IV.13. "Камень, адкінуты будаўнікамі" ........................................ 234
IV.14. Падвышэнне Пачэснага і Жыццядайнага Крыжа ........................................ 236
IV.15. Казанне на свята Андрэя Першапаклікана ........................................ 240
IV.16. Шлюбная вячэра ........................................ 243
IV.17. Старое віно і новая ахвяра ........................................ 245

POST-PARTOR* – СПАДКАЕМЦА ........................................ 249

ГЛАСАРЫЙ ........................................ 251

ЛІТАРАТУРА ........................................ 253

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## IV.4. "Хай будуць усе адно"

"Хай будуць усе адно: як Ты, Ойча, ува Мне, і Я ў Табе, так і яны будуць у нас адно [Ян 17, 21]. Апошняе слова, сказанае Госпадам на шлях удасканалення свету людзей у свет Божы вызначае цяжкі, працаёмкі, шматпакутлівы, але шчаслівы, спрыяльны шлях, якім сусветная Царква паступова набывала праўдзівыя веды, уласны, непадкупны вопыт, свядомую дысцыпліну, не крывадушную любоў, самастойнасць і незалежнасць ад вонкавых секулярных абставін. У выніку Царква здабыла сабе сёння такое становішча, якое ўжо заслугоўвае Божага вызначэння "цвярдыні нябеснай" [Быц 1, 6].

Мы ведаем, што спачатку гэты шлях Царква праходзіла ў арганічным спалучэнні Усходу і Захаду, Канстанцінопальскай і Рымскай традыцый хрысціянства. У ходзе першых васьмі Сусветных Сабораў іерархі памесных цэркваў, кіруемыя Духам Святым і ўласным жаданнем еднасці, ня гледзячы на існуючыя праблемы царкоўнага ўладкавання, урэшце рэшт знаходзілі агульныя асновы для іх рашэнняў. Таму ў Нядзелю айцоў наша свядомасць патрабуе больш уважлівага меркавання ў гісторыі і практыцы ўтрымання Хрыстовай еднасці ў першым тысячагоддзі Яго Логасу.

Каб зразумець сутнасць дагматычных разважаванняў на першых сусветных Саборах, трэба памятаць, што само іх скліканне было абумоўлена супярэчнасцю чалавечых ведаў адносна Валадарства Божага і парадкау яго домабудаўніцтва ў розных этнарэлігійных і асветніцка-адукацыйных умовах таго часу. Асаблівасць гэтых разважаванняў была адзначана яшчэ апосталам Пётрам, які нагадаў вернікам аб тым, што ва ўсіх Саборных пасланнях "Ёсць дзе што нязручна зразумелае, што невукі і неўгрунтаваныя на ўласную сваю загубу перакручваюць, як і другія Пісанні" [2 Петр 3, 16]. Апостал Павел, наստаўляючы вучняў у праўдзівым веравызнанні, таксама папярэджваў: "Мусяць быць між вамі супярэчнасці, каб выявіліся адмысловыя" [1 Кар 11, 19].

Адным з асноўных вонкавых стымулаў Сабораў былі ерасі (з грэчаскай мовы, выбар). Рэлігійна-сектанцкія кірункі адступлення ад кананічнага вучэння Царквы ўскладнялі яе раннюю гісторыю за кошт распаўсюджвання ерасяў арыян, нестарыян, менанітаў, дакетаў і іншых. Менавіта аб гэтых наследаваннях папярэджваў хрысціян апостал Павел сваёй развітальнай прамовай у Міліце: "Пільнуйце ж самі сябе і ўсе статкі, у якіх Дух Святы паставіў вас за біскупаў, каб пасвіць Царкву Бога, якую Ён прыдбаў уласнай крывёй Сваёй. Я ж ведаю, што пасля адыходу майго прыйдуць да вас ваўкі лютыя, якія не пашкадуюць статку, ды і пасярод вас саміх паўстануць людзі, якія будуць гаварыць скажона, каб прыцягнуць вучняў за сабой" [Дзеі 20, 28].

Дзеля мэты захавання чыстаты царкоўнай ідэі Хрыстовага вучэння збіралася вышэйшае духавенства, дэлегіруемае памеснымі цэрквамі ў адпаведнасці з усталяванай працэдурай. На Сусветных Саборах распрацоўвалася і зацвярджалася сістэма веравызнання і царкоўная культура, фарміраваліся кананічныя і богаслужэбныя правілы, ацэньваліся розныя багаслоўскія канцэпцыі, вызначаліся спосабы барацьбы з ерасямі.

Трэба асабліва адзначыць, што Сусветныя Саборы сталі склікацца па ініцыятыве візантыйскіх імператараў, якія нярэдка старшынствавалі на іх і самаўласна ўплывалі на рашэнні, якім адразу ж надаваўся статус дзяржаўных законаў (дыгестаў). Гэтае становішча, з аднаго боку, спрыяла ўзмацненню ўплыву царкоўнай улады на свецкія зносіны, але, з іншага боку, садзейнічала ўзнікненню такой негатыўнай з'явы на хрысціянскім усходзе, як "цэзарапапізм", г.зн. дзяржаўнае падпарадкаванне Царквы.

Коратка нагадаем даты Сабораў і іх асноўныя рашэнні.

I С.С. – Нікейскі (325 г.) – прыняў у першай рэдакцыі сімвал веры, асудзіў арыянства як "бязбожную ерась", вызначыў час святкавання Пасхі, выпрацаваў дваццаць канонаў, у тым ліку аб прывілеях рымскага, антыяхійскага, александрыйскага і ерусалімскага мітраполій.

II С.С. – Канстанцінопальскі (381 г.) – удакладніў сімвал веры, асудзіў ерасі арыян, яўноміян, фацініян, савеліян, маркеліян і інш., выпрацаваў формулу траічнасці Бога, кананізаваў Сімвал веры і зацвердзіў правіла, згодна якому Канстанцінопальскаму патрыярху услед за рымскім прадстаўлялася прывілея перад усімі іншымі біскупамі. Кіраўніком Канстанцінопальскага патрыярхату быў прызначаны Грыгорый Багаслоў.

III С.С. – Эфескі (431 г.) – праходзіў у абстаноўцы лютай барацьбы мітраполій за першынства. Сабор асудзіў нестарыянства і прызнаў Дзеву Марыю Багародзіцай.





РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

IV С.С. – Халкідонскі (451 г.) – асудзіў монафізіцтва Александрыйскай багаслоўскай школы і антыяхійскіх нестарыян; зацвердзіў формулу аб Ісусе Хрысце як праўдзівым Богу і праўдзівым чалавеку, існым Богу Айцу і прадстаўляючым Сабой дзве натуры, але адну іпастась. Монафізіты адмовіліся прыняць гэту фармулёўку і вылучыліся ў самастойную Царкву (армяны, копты). Сабор прызнаў, але ўжо без удзелу рымскіх легатаў, першынство ў хрысціянстве канстанцінопальскага патрыярха.

V С.С. – II Канстанціопальскі (553 г.) – быў заклікааны, каб адобрыць эдыкт імператара Юсцініяна I, асудзіўшага “трох старшынь”, г.зн. трох багасловаў – Федара Мапсуэтскага, Феадарыта Кірскага і Іву Эдэскага, не лічыўшых Хрыста Богачалавекам, а Марыю – Богамацер’ю, не прызнаўшых рашэнняў Халкідонскага Сабору і падтрымаўшых нестарыянства. Было таксама асуджана як ерась вучэнне Арыгена.

VI С.С. – III Канстанцінопальскі (680 г.) – асудзіў ерась манафізіцтва, аднавіў мір з папам, парушаны арыянам і ссылкай папы Марціна па загадзе візантыйскага імператара.

VII С.С. – II Нікейскі (787 г.) – асудзіў ерась іканаборства і зацвердзіў вызначэнне аб шанаванні ікон і крыжа.

VIII С.С. – IV Канстанцінопальскі (870 г.) – выявіў вострыя супярэчнасці між заходняй і усходняй Цэрквамі, асудзіў царкоўна-гегеманісцкую палітыку патрыярха Фоція. Рашэнні гэтага Сабору былі ў адпаведным парадку адменены Канстанцінопальскім памесным Саборам у 880 г., таму сучасная гісторыя Праваслаўя не аналізуе канонаў VIII Сусветнага Сабору, і наогул яго не ўспамінае.

Пасля вялікага падзелу цэркваў у 1054 годзе Сусветная Царква правяла яшчэ 13 Сабораў, апошні, 21 Сусветны, ці II Ватыканскі, – адбыўся ў 1962 – 1965 гг. і прыняў глабальныя рашэнні адносна літургічнай рэформы, аб экуменізме, аб Усходніх Царквах (Orientalium Ecclesiarum). Апошні дэкрэт пацвярджае, што ўсходнія каталіцкія цэрквы застаюцца ў поўным адзінстве з рымскай апостальскай сталіцай, з’яўляюцца часткай каталіцкай Супольнасці, г.зн. захоўваюць паўнату эклесіяльнасці, і маюць звязаныя з гэтым правы і абавязкі.

Усходняя Царква за апошняе тысячагоддзе праводзіла толькі памесныя Саборы, напрыклад, Сабор Рускай Праваслаўнай Царквы 1988 г., прысвечаны тысячагоддзю Хрышчэння Русі.



У развіцці свайго ўплыву на ўлады Заходняя Рыма-Каталіцкая Царква знаходзілася ва ўмовах больш спрыяльных, чым Усходняя. Умацаванню яе самабытнасці, незалежнасці ад свецкіх улад вельмі садзейнічаў статут Святога Пасаду з адпаведнай дактрынай аб прымаце Апостала Пятра і Рымскага біскупа як яго наступніка. У гэтым пачатку Рымскі папа не толькі захаваў свае значэнне, дасягнутае ў I – III стагоддзях, але і памножыў яго ў канцы Пятага стагоддзя пасля падзення заходнерымскай імперыі. Дзве вялікія ідэі, паводле разумення вядомых гісторыкаў Лавіса і Рамбо, уражвалі варвараў: еднасць усяго старажытнага свету пад уладай Вечнага Горада і ўплыў рымска-каталіцкага хрысціянства на свет як універсальнага вобраза яго пераўтварэння: “Дзейная і вопытная Заходняя Царква служыла пасрэдніцай між старажытным светам і варварамі, усходняя ж траціла свае разумовыя і фізічныя сілы ў дробных спрэчках аб дагматах і нікчэмных разладах” [39, с. 287].

Але, робячы сваю справу на Захадзе, папа не заставаўся абыякавым да ўсходніх падзей у час Сусветных сабораў. Папы самі на іх не прысутнічалі, але пасылалі дэлегатаў і не ўпускалі ніводнага выпадку, каб сказаць сваё аўтарытэтнае і ўласцівае слова, заступіцца за пакрыўджаных, паклікаць да сябе на суд крыўдзіцеля ці завочна прамовіць суд. Так, Рымскі папа Юлій прымае актыўны ўдзел у лёсе ганімых на Усходзе праваслаўных біскупаў, у тым ліку Святога Афанасія, Святога Васіля Кесарыйскага, Маркела, Паўла і іншых. Папа Інакенцій Першы прымае бок Яна Златавуснага пасля яго асуджэння на саборы “пад дубам” у 402 г. і запрашае да сябе на Сабор. Святы Кірыл Александрыйскі перад сваім выступленнем супраць ерэтыка Нестара раіцца аб сваім намеры з папам Калестынам. Пасланне папы святога Льва Першага да арцыбіскупа Канстанцінопальскага Флавіяна і яго фундаментальная роля ў дагматычным вызначэнні Халкідонскага Сабору агульнапрызнана. Эпоха Пятага Сусветнага Сабору сведчыць аб тым, як у гэты час увесь Усход згадзіўся падпісаць недарэчны эдыкт імператара Юсцініяна супраць траіх старшыняў, і толькі Захад энергічна пратэставаў сваім палемічным сачыненнем “У абарону



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

трох старшынь", нанісаным біскупам Факундам Герміёнскім. У цяжкія гадзіны монафіліцкіх спрэчак канстанцінопальская кафедра дала аж чатырох патрыярхаў-ерэтыкоў (Сяргея, Піра, Паўла, Пятра), а рымская – папу-пакутніка ў твары св. Марціна Першага, абараніўшага ад навалы шальмавання св. Максіма Вызнаўцу. Пасланне папы Агафона на Шостым Сусветным саборы адыграла такую ж ролю, як і пасланне Льва Вялікага на Халкідонскім саборы. Дэлегаты папы Адрыяна Першага на Сёмым Саборы рашуча ўздзейнічалі на пастановы аб адмене іканаборства, якога на Захадзе не было. Перажыўшы шмат ад візантыйскіх імператараў, папы з уважлівасцю і спачуваннем ставіліся да ганімых на Усходзе хрысціян і чым маглі дапамагалі ім.

Прафесар царкоўнай гісторыі Пасноў, канстатуючы факт высокай самасвядомасці і мужнасці ў барацьбе з візантыйскімі імператарамі рымскіх біскупаў, распавядае: "Действительно, западная иерархия, во главе с римским епископом, по отдалённости расстояния и политическим обстоятельствам более свободная от деспотизма византийских императоров, обычно давала решительный отпор их незаконным действиям, не останавливаясь даже перед соборным осуждением императорских эдиктов, и римские епископы не раз в своих посланиях к императорам высказывали со всей определенностью традиционный принцип независимости Церкви в делах веры и церковного управления" [39, с. 289].

І цяпер, у гадзіну суровых выпрабаванняў для ўсходніх цэркваў, Сусветная Царква вылучае мэту плённага супрацоўніцтва усходняй і заходняй цэркваў, высока ацэньвае ўстанаўленні, літургічныя абрады, культурныя традыцыі, уклад хрысціянскага жыцця на Усходзе. У гэты час усе хрысціяне, усходнія і заходнія, настойліва ўзносяць свае гарачыя і нястомныя, штодзённыя малітвы, каб заступніцтвам Найсвяцейшай Багародзіцы здзейсніўся апошні і самы галоўны Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста, "Каб усе былі адно". Братняй любоўю і прыхільнай пашанай адзін да аднаго вернікі абавязкова дасягнуць пэўнай радасці і пацяшэння ад Святога Духа ў супольнасці свабодных людзей Божых, назва якой "Цывілізацыя любові".



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ